**Сутула Г.** Дзённік простага смяротнага: аповесць / Г. Сутула. — Мн.: Беларус. Кнігазбор, 2002. — С. 38–40.

Косця Ігнацьеў усяго на год маладзейшы за мяне. Жыў у суседняй вёсцы Верхняе. Заканчваў тую ж школу, што і я.

Мне пашчасціла нарадзіцца дзяўчынай: вучылася, працавала, выйшла замуж, стала маці. Ён быў хлопцам і трапіў у Афганістан. Доўга залечваў цяжкае раненне. У сям'ю вярнуўся жывым, але са скалечанай псіхікай. А дома праблемы бытавыя, працоўныя, асабістыя...

Памятаю, працавала карэспандэнтам у раённай газеце «Шлях перамогі» *і* хацела напісаць замалёўку пра афганца. У той час, сярэдзіна васьмідзесятых, гэту тэму асвятлялі павярхоўна, пад патрэбным партыі «пунктам гледжання», без асаблівых падрабязнасцяў, прыкрываючыся «ваеннай тайнай». Звярнулася да старшыні калгаса імя Чапаева, пачала распытваць пра Косцю. Не думала, што пра чалавека, які страціў на вайне здароўе, можна было сказаць: «Лайдак ён, п'яніца, з галавой у яго не ў парадку. Не заслужыў ён, каб пра яго пісалі».

Аказваецца, многія афганцы, якія трапілі на перадавую, заслужылі толькі права быць забітымі ці скалечанымі, а права быць увекавечанымі пры жыцці не мелі. Імі карысталася толькі вечна жывая камуністычная партыя. Як крыўдна за людзей!

У той раз я напісала пра прыкладнага афганца Сяргея Бугая з саўгаса імя Дзяржынскага. Пісала пра яго сям'ю, каханне, працу, толькі не пра вайну. Хлопец быў добра вышкалены, і ні слова не вымкнулася пра яе.

А з Косцем я усё ж пагаварыла. Нечакана сустрэліся на аўтобусным прыпынку ў Верхнім. *Я* ішла ад бацькоў і збіралася ехаць у Глыбокае, а ён сядзеў у адзіноце, не ведаў куды ісці. Быў выпіўшы. Ніколі не забуду яго, напоўненых болем і роспаччу слоў:

– Я ведаю, што ўсе лічаць мяне ненармальным. У «псіхушку» з радасцю здалі б і жонка, і бацькі, і старшыня. А я не дурны. Верыш, Галя, не дурны. Каб ты толькі ведала, што я перажыў!

Ён успамінаў:

Самалёт зрабіў «пятлю» над далінай.

— Падрыхтавацца, – прагучаў кароткі загад, – пайшлі! Адзін за другім мае сябры валіліся ў бездань блакіту. *Я* быў апошнім. Па звычцы глянуў у акно: парашутных «шапак» відаць не было. Глядзеў і не верыў вачам сваім: шэрым каменнем хлопцы падалі ўніз. Здавалася, Бог ператвараў грэшных людзей у валуны і кідаў іх на такую ж грэшную зямлю...

Я плакаў. Упершыню за паўтара года афганскай бойні. Адчуў віну за дарэмна загубленыя жыцці. Тады і зразумеў, што перавага ў сіле, тэхніцы, узбраенні і ваенным майстэрстве знішчаць ва ўгоду нейкай ідэі на самой справе не прынясе жаданай перамогі, а толькі грахі шмат грахоў, за якія некалі прыйдзецца дорага плаціць.

На зямлі загінуўшых памянулі свечкай, чаркай і горкім маўчаннем. Вінаватых у здарэнні не было – усё спісалі на вайну. А бацькам паляцелі лісты з «суцяшальнымі» радкамі: «Ваш сын гераічна загінуў у баі… Вы можаце ганарыцца ім**.** Ён да канца выканаў свой воінскі абавязак».

Было шкада сяброў, з якімі больш года дзяліў н*ягоды* салдацкай службы. Лічыў сябе вінаватым, таму што застаўся жывым. Тады піў спірт, як ваду, пакуль не страціў прытомнасць...

А што было, калі мы займалі іх сяло? Па загаду ўсіх расстрэльвалі жанчын, дзяцей, старых. Калолі, рэзалі, тапталі танкамі.  На гусеніцах абматаныя дзіцячыя кішкі, кроў, як вада... Не

выканаеш загад – самому расстрэл. Іх бы, цяперашніх разумнікаў, туды, на перадавую.

Пасля ўсіх гэтых трагедый з галавой пачало рабіцца незразумелае. Правальваюся, як у яму, *і,* здаецца, я там, у Афгане. І хочацца ўсіх і ўсё знішчаць... А я ж не дурны, не дурны. Чым такое жыццё, лепей бы цынкавая дамавіна.

Горкая споведзь са слязамі на вачах. Споведзь, на якую б не адважыўся цвярозы. Ды і ці было каму выгаварыцца?

Ён не маніў мне, але такую праўду не змясціца б ніводная газета. У тым была сутнасць савецкай «свабоды» распаўсюджвання інфармацыя.

Я спрабавала суцешыць Косцю. Прасіла пацярпець. Адпраўляла да дактароў. Пераконвала ў неабходнасці не апускацца, верыць у сябе, прасіць дапамогі ў Бога. Ён доўга не змог.

Раніцай дамашнія разыходзіліся хто куды. Косця чакаў, калі застанецца адзін. Выхад з невыноснага становішча быў знойдзены.

Ліхаманкава ўсхапіўся. Аказаўшыся на кухні, зашчапіў дзверы, зачыніў фортку, зашторыў акно. Адключыўшы ад газавай пліты балон, адкруціў яго да адказу. Ні аб чым не думаў, баяўся толькі аднаго: каб не перашкодзілі.

Са змяіным шыпеннем з балона вырваўся кіславата-металічны струменчык.

Бразнула клямка. Нехта пацягнуў за дзверы раз, другі, трэці.

– Косця, адчыняйся, – пачуў хлопец бацькаў голас. – Не дуры. Што яшчэ прыдумаў?

Да бацькавага голасу далучыўся голас Косцевага равесніка Колькі. Косця не адзываўся. Дзверы рвалі, не шкадуючы.

Дыхаць рабілася цяжэй і цяжэй, нарэшце стала зусім невыносна. Косця захліпаўся. Дрыготкімі пальцамі схапіў запалкі. Яны ламаліся, не загараліся...

Дзверы зляцелі з пяцель і бразнулі ў кухню. У той жа момант запалка пстрыкнула доўгачаканым агеньчыкам. Раздаўся выбух. Сябра Колька, якога выкінула за парог, ваяваў з агнём, што апанаваў цела. Пражорлівае полымя ахапіла пакой. Свечкай дагарала тленнае цела...

Пахавалі Косцю на вясковым могільніку. Апошнім грэхам лягло самазабойства на змучаную апантаную душу. Адзіная памінальная свечка, пакінутая бацькамі ля ўзгалоўя магілы, ціха патрэсквала, чадзіла, плакала васковымі слязьмі. У яе агні канала, дагарала скалечаная нягодамі грэшная чалавечая душа.

Гэтыя радкі непрыдуманай гісторыі я паклала ў аснову апавядання «Памінальная свечка» і прысвяціла яго тым, хто трапіў у афганскае пекла.

Сказанае хачу завершыць біблейскай мудрасцю, якая перасцерагае ўсіх нас: «Вы куплены дарагой цаною; не рабіцеся рабамі чалавекаў».

**Г. Сутула**